■ Магія аўтастопа

# САПРАЎДНАЕ КАХАННЕ НА ДАРОЗЕ НЕ ВАЛЯЕЦЦА

## Яно па ёй падарожнічае

**Непрадказальнасць, прыгоды і адрэналін — бадай што самыя асноўныя складнікі падарожжа аўтастопам, што вабіць да сябе няўрымслівых і апантаных людзей. Цуд яго ў тым, што ты ніколі не ведаеш, дзе апынешся. Ранкам можаш мокнуць пад дажджом пасярод лесу, а ўвечары — з новымі знаёмымі частавацца ласункамі ў катэджы. Паспытаўшы смак вольнай вандроўкі раз, адмовіцца ад гэтага занятку ўжо немагчыма — ты прагнеш новых падарожжаў.**

**У такіх рамантычных і цікавых, а часам і няпростых абставінах жыцця ў дарозе нараджаюцца адносіны, сяброўства і каханне. Так здарылася і ў нашых герояў: Надзеі і Ільі, якія ўпершыню ўбачыліся за дзень да сумеснага падарожжа аўтастопам на Каўказ, а праз пару месяцаў пажаніліся.**

### ЖАДАННІ ЗДЗЯЙСНЯЮЦЦА

Калі азірнуцца на год назад і паспрабаваць зразумець, як усё адбылося, то відаць, што сустрэча маладых людзей — гэта яго вялікасць Выпадак, калі супалі абставіны, жаданні і, пэўна, умяшаўся сам лёс.

У Надзеі Насенкі за плячыма быў 10-гадовы вопыт аўтастопа. Ездзіць пачала з 16-ці і ўжо наведала Расію, Украіну, Польшчу, Літву, Германію, Бельгію, Галандыю, Люксембург. Яна часта шукала спадарожнікаў праз адпаведныя суполкі ў інтэрнэце, аднак ні разу так і не дамовілася да сумеснага падарожжа. Звычайна адпраўлялася ў паездкі з сяброўкай ці агульнымі знаёмымі. Для Ільі Данілава гэта стала першым вялікім выпрабаваннем сябе. Дагэтуль ён ездзіў аўтастопам толькі па Беларусі.

*— Год назад я звольнілася з працы і перад уладкаваннем вырашыла з'ездзіць хоць куды. Зноў шукала спадарожнікаў, аднак з тымі, хто адгукнуўся, не супалі то маршруты, то патрабаванні да паездкі, —* успамінае Надзея. *— Нарэшце мы з сяброўкай паехалі ў Пецярбург, і калі ўжо вярталіся назад, пазваніў Ілья, які прапанаваў рвануць у Кыргызстан на тры тыдні. Я яму растлумачыла, што такога тэрміну недастаткова, і калі прыдумае нешта іншае, хай зноў звоніць.*

Праз нейкі час дзяўчына забылася на званок, аднак бліжэй да верасня Ілья прапанаваў паехаць на Каўказ. Надзея да апошняга не верыла, што гэта атрымаецца, бо вельмі хацела ў такое падарожжа і нават планавала некалькі разоў, але заўжды нешта перашкаджала.

*— У мяне з дзяцінства была мара — убачыць горы са снежнымі вяршынямі. Я думаў, што калі не зраблю гэтага, то і паміраць буду з тугой ад нязздзейсненага, —* падзяліўся Ілья. *— Аднойчы выпадкова зайшоў на сайт аўтастопшчыкаў і зразумеў, што гэта якраз тое, што мне трэба. Вырашыўшы звярнуцца па дапамогу да спрактыкаваных людзей, я знайшоў паведамленне Надзеі.*

### Парады пачаткоўцам

✓ Не баяцца і верыць у поспех.

✓ Давяраць інтуіцыі і адчуваць настрой вадзіцеля: ці хоча ён, каб вы гаварылі, або лепш пасядзець моўчкі.

✓ Калі едзеш ноччу, ні ў якім разе не спі! Гэта пытанне бяспекі.

✓ Ні ў якім разе не ездзіць выпіўшы!

✓ Аўтастопам можна вандраваць увесь год: галоўнае — ведаць, што цябе чакае ў пэўнай мясцовасці ў той час, калі ты туды збіраешся.

### «Я ВАС БЛАСЛАЎЛЯЮ»

Напярэдадні паездкі мінчанка і хлопец з Гродзеншчыны ўпершыню ўбачыліся літаральна на 15 хвілін, каб абгаварыць «працоўныя» моманты:

*— Ты для мяне проста спадарожнік, мы едзем разам, але ніякіх заляцанняў.*

*— Дамовіліся. Мне ўвогуле цікава на горы паглядзець, а не на цябе.*

За 20 дзён падарожжа Надзея і Ілья праехалі Пяцігорск, Чачню, Дагестан, Азербайджан, Грузію, Каўказ, Сочы. Маршрут прыйшлося карэкціраваць на хаду, як часта і бывае ў аўтастопе. Пачаўшы прыгоды як незнаёмыя людзі, на радзіму яны вярнуліся ўжо як пара.

Першыя некалькі дзён былі звычайныя: маладыя людзі мянялі машыны, абмяркоўвалі дарожныя моманты. Затым пачаліся акалічнасці. Спачатку знайшлася машына, у якой яны ехалі ажно суткі. Пакуль вадзіцель адпачываў, яны гулялі па палях. Пасля шафёр-азербайджанец спытаўся ў аўтастопшчыкаў, ці чакае іх хто дома. Атрымаўшы станоўчы адказ, выдаў незвычайнае: «Раз вы кінулі сваіх палавінак, то яны вам і не надта патрэбны, усё ў вас атрымаецца. Я вас бласлаўлю».

Тады гэта здавалася смешным, але менавіта ў Баку, дзе два дні Ілья і Надзея гасцявалі ў азербайджанца, і нарадзілася іх каханне.

*— Магчыма, гэта нейкая магія аўтастопа здарылася. Для мяне тое падарожжа стала такім, пра якое я заўжды марыла. Яно было спантанным, маршрут мяняўся, але ўрэшце я адчула, што так і павінна быць, а Ілья — мой чалавек, —* падзялілася Надзея. *— Ён, як і я, у любы момант можа сарвацца і паехаць вандраваць.*

*— Я да гэтага не разумею, як усё так склалася. Мы спачатку баяліся, што нашы адносіны вытрываюць выпрабаванне побытам і адлегласцю* (па размеркаванні Ілья тады працаваў у Аршанскім раёне. — **Аўт.**). *— Але ўсё неяк упарадкавалася, я атрымаў перавод у Мінск, і мы сталі жыць разам.*

### ВЯСЕЛЛЕ БЕЗ СВЕДАК

Праз тры тыдні пасля падарожжа маладыя людзі гулялі па Лошыцкім парку. Надзея раптоўна сказала: «Давай пажэнімся». Сказана — зроблена. Яны падавалі заяву ў ЗАГС у Карэлічах, адкуль родам Ілья, але яе не прынялі — матывавалі адмову неабдуманым рашэннем маладых людзей. Тады яны прыйшлі ў ЗАГС Мінска і спыталіся: «Калі можна пажаніцца як мага хутчэй?».

14 лістапада, праз тыдзень пасля гэтага, без цырымоніі і сведак, адразу пасля адкрыцця ЗАГСа яны сталі мужам і жонкай.

Сваякі даведаліся пра «вяселле» значна пазней. Маці Надзеі — праз месяц ад дачкі, а маці Ільі ўвогуле атрымала вестку пра шлюб сына ад агульных знаёмых ледзьве не праз паўгода. На маладых ніхто не крыўдзе (першы шок даўно прайшоў), і матулі нават ганарацца сваімі непрадказальнымі і арыгінальнымі дзецьмі.

*— Цяпер я адчуваю, што жыву сваім жыццём. Мой любы чалавек падтрымлівае мае жаданні, і ў нас адны мары на дваіх. Разам з тым я не адчуваю сябе жонкай у літаральным сэнсе, якая завіхаецца па гаспадарцы і плануе колер шпалераў ці памеры мэблі.*

*— Я шчаслівы ад таго, што мы разам, і ад таго, што нашы жаданні супадаюць. На жаль, магчымасці не заўсёды дазваляюць ім здзяйсняцца. Вось прыйшлося адпусціць Надзю з сяброўкай у Адэсу, бо я атрымаў толькі два тыдні водпуску замест месяца. Тады і зразумеў, што такое перажыванні за жаноцкі аўтастоп. Але ж утрымліваць яе я не меў права.*

### «НАЗБІРАЙ ГРОШАЙ І ПАЕДЗЬ, ЯК НАРМАЛЬНЫ ЧАЛАВЕК»

Аўтастоп — рэч умоўна бясплатная, бо, як ні круціся, а нейкія сродкі ў цябе павінны быць, ці мала што здарыцца? Можна прынцыпова не браць з сабой ні капейкі, але тады трэба спадзявацца на волю нябёсаў ці зарабляць у дарозе.

*— Некаторыя спрабуюць зарабіць спевамі і танцамі. Калі зусім нічога не ўмееш, прапануй дроў накалоць, разгрузіць нешта, проста дапамагчы па гаспадарцы, —* разважае Надзея. *— Я ведаю адну дзяўчыну, якая ў дарозе майструе нейкія вырабы, а ў горадзе іх прадае за «хто колькі дасць». З іншага боку, колькі грошай не возьмеш, усё роўна іх расходуеш. Скажам, хочаш ты піць. Калі ёсць грошы, ты купіш піва, а калі няма, то папросіш у гаспадароў вады, знойдзеш калонку ці крыніцу. Увогуле, чалавеку не так шмат трэба, як нам навязваюць стэрэатыпы.*

*— Мама спачатку казала мне: «Назбірай грошай і паедзь, як «нармальны чалавек». Але ж пакуль будзеш іх збіраць, яны могуць стаць не сродкам дасягнення мары, а мэтай. Штосьці спатрэбіцца набыць, камусьці пазычыш. І проста апынешся ў коле. Таму аўтастоп — спосаб быць вольным. Да таго ж у падарожжы можа ўсякае здарыцца. Прапануюць, напрыклад, папрацаваць валанцёрам ці застацца на сезонных работы, падчас якіх можна таксама вандраваць па гэтай краіне, —* дадае Ілья. *— Часам глядзіш на нейкую прыгожую замалёўку з белым пясочкам ды акіянам, уздыхаеш, марыш, а многім і ў галаву не прыходзіць, што ты ж можаш там пабываць. Збірайся, галасуй і падарожнічай.*

Ілья — інжынер-электрык, абслугоўвае кандыцыянеры ў радзільных дамах. Па начах працуе адміністратарам у забаўляльным цэнтры свайго брата. Надзея — сацыяльны педагог у сталічным прытулку. Абаім праца падабаецца, але ж вандроўкі вабяць больш. Кажуць, на вясну запланавалі падарожжа ў Азію праз Грузію ці больш. Дарэчы, нядаўна сям'я Данілавых вярнулася з двухтыднёвага падарожжа ў Малдавію і Карпаты.

*— Я не ведаю, якім будзе наша жыццё далей, але я не хачу быць чалавекам з патухлымі вачыма, якіх я часам сустракаю на вуліцах, —* упэўнены Ілья.

*— Думаю, калі я вярнуся пасля гэтай вандроўкі, стану ўжо другім чалавекам, —* разважае Надзея. *— Пакуль што я прагну новых пачуццяў і мясцін і не ведаю, ці прыйдзе час, калі я скажу, што не хачу больш нікуды ехаць.*

**Ірына СІДАРОК** ■



Ілья і Надзея ў сёлетнім падарожжы па Карпатах.



Аўтастопшчык на дарозе, як дома.



Мара здзейснілася: Ілья знайшоў свае снежныя вяршыні.

### Дарожныя байкі сям'і Данілавых

• Самы цудоўны аўтастоп быў у Дагестане. Ледзьве падымеш руку — спыняецца па дзве машыны, вадзіцелі добразычлівыя, цікавяцца, адкуль мы, хто. Аднак там нас і напужалі. Першы раз, калі мы селі, я прышпіліўся, а мяне шафёр адшпільвае. Я бачыў, што яны ўсе непрышпіленыя ездзяць, але настойваю на сваім: «Мне жыццё даражэй». А ў адказ: «Табе гэта не дапаможа», і як націсне на газ да 200-220. Тут у мяне і мову адняло, і жыццё перад вачыма прайшло. А ў іх 140 — гэта нармальная хуткасць, як у нас 90. Прычым вадзіцелі носяцца незалежна ад маркі аўто і яго магчымасцяў.

• У Грозным мы знайшлі праспект Пуціна і пачалі там здымацца, як раптам нас паклікалі паліцэйскія. Пытаюцца: «Чаму ты ў шортах?». «Дык спёка ж, 35 градусаў!» «На цябе глядзяць нашы сёстры, матулі, гэта дрэнна. Ёсць у што пераапрануцца?» Зразумела, я пайшоў порткі нацягваць, але не адышоў і пары крокаў, як з той жа заўвагай падышлі мясцовыя хлопцы, яны ж нам дапамаглі і за горад выехаць.

• У Чачні мы паставілі намёт на ноч у лесе, а тут галасы нейкія, гоман, крыкі. Я вырашыў паглядзець, што адбываецца, і раптам — стрэлы. Я на зямлю ўпаў, думаю, няўжо і праўда вайна пачалася? А нас усю дарогу ад Каўказа палохалі: «Чаго вы ў Чачню прэцеся, хіба не ведаеце, што там адбываецца? Здадуць вас на працу на цагляны завод ці кукурузу лушчыць адправяць». Аказалася, быў Дзень незалежнасці, а стрэлы — салют. Але ж добразычлівцы нас так накруцілі, што мы гатовы былі ў самае горшае паверыць.